УДК 821.161.3.09-83“18”

# НАРОДНЫЯ ЎЯЎЛЕННІ ПРА ГРЭХ
# У БЕЛАРУСКІХ ГУТАРКАХ XIX ст.

**Кісялёва Лія Генадзьеўна**
Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі
(г. Мінск, Беларусь)

*У артыкуле разглядаецца шэраг вершаваных гутарак XIX ст., якія адлюстроўваюць народнае разуменне хрысціянскай этыкі і выкрываюць найбольш пашыраныя ў сялянскім асяроддзі грахі.*

Гутарка (бессюжэтны вершаваны, радзей празаічны твор, асноўны змест якога складаюць разважанні на сацыяльныя або маральна-этычныя тэмы) – адзін з самых пашыраных і адметных жанраў беларускай літаратуры XIX ст. У народным асяроддзі даволі папулярныя былі гутаркі ў форме казані (пропаведзі). Найбольш вядомая з іх была апублікавана яшчэ ў 1873 г. І. Насовічам (з рукапісу, які ён атрымаў у 1848 г.) і звычайна фігуруе ў даследаваннях і хрэстаматыях пад назвай “Вось цяпер які люд стаў”, нададзенай па першым радку. Ёсць і шэраг іншых гутарак XIX ст., у большай ці меншай ступені падобных да гэтай. Усе яны ўяўляюць з сябе працяглыя (у некаторых версіях – больш за 200 радкоў) маналогі – развагі пра маральны заняпад і дэградацыю грамадства, якое выраклася Бога. У гэтых творах з прыкрасцю канстатуецца абсалютны духоўны калапс у соцыуме і падрабязна пералічваюцца формы і спосабы, якімі сучаснікі-суайчыннікі парушаюць усе Боскія запаветы. Вось менавіта гэты пералік, “нанізванне” адзін на аднаго шматлікіх прыкладаў паводзінаў, якія супярэчаць хрысціянскай маралі (своеасаблівая “ланцуговая” кампазіцыя), і з’яўляецца асноўнай характарыстыкай гэтай разнавіднасці гутарак.

Пры параўнанні гэтых твораў адразу кідаюцца ў вочы маленькія і вялікія паўтаральныя тэкставыя “модулі”, якія сустракаюцца ва ўсіх ці ў многіх гутарках: напрыклад, апісанне распусты (“Цяперь на Бога не дбаюць, / Иншіе по двѣ жонкі маюць, / А жонки часомъ трехъ мужоу” [4, с. 72]) і сквапнасці (“Над скарынкай хлеба млеюць, / Даць галоднаму жалеюць” [4, с. 68]). Практычна ва ўсіх гутарках гаворыцца пра бязмежнае пашырэнне п’янства і амаль даслоўна пераказваецца гісторыя пра небараку, які, напіўшыся, адмарозіў рукі-ногі і цяпер жабруе, апраўдаючы небыліцы пра сваё калецтва, а атрыманую міласціну па-ранейшаму нясе ў карчму.

Разам з тым нельга не заўважыць, што ў асобных гутарках-казанях ёсць і цалкам адметныя “модулі”, якіх няма ў іншых творах, – і ў некаторых менавіта яны складаюць пераважную большасць тэксту. Таму тут, відаць, ёсць сэнс казаць пра досыць цікавую практыку, калі невядомыя нам аўтары, адштурхоўваючыся ад пэўнага ўзору і выкарыстоўваючы яго як “каркас”, стваралі ўласны новы тэкст. Аснова складалася, як з канструктара: гатовыя “дэталі” манціраваліся ў адвольным парадку. Астатняе было плёнам імправізацыі: кожны аўтар падмацоўваў галоўныя тэзісы канкрэтыкай. Напрыклад, ва ўсіх творах як вялікі грэх разглядалася непаважлівае стаўленне да бацькоў і ўвогуле нямала ўвагі надавалася разнастайным сямейным канфліктам, але ў гутарцы з архіву Л. Бэндэ, упершыню апублікаванай М. Хаўстовічам [4, с. 84–91], разважанні на



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

гэтую тэму ілюструюцца "батальнымі" сцэнамі – апісаннем лютых боек паміж сваякамі.

Гэткім жа чынам трансфармавалася ў працэсе вуснага бытавання і іншая гутарка XIX ст. – "Страшны суд". В. Ластоўскі, згадваючы сваё юнацтва, якое прайшло ў вёсцы Стары Пагост Дзісенскага павета і прыпадала на 1890-я гады, пералічваў папулярныя сярод яго землякоў творы і пісаў: "Асаблівай увагай цешныўся "Страшны суд", які дапаўняўся і перарабляўся; устаўляліся ў яго штрофкі аб акалічных хлапцах, дзяўчатах, гаспадарох і гаспадынях з абазначаньнем ім кар на тым сьвеце" [2, с. 47].

"Страшны суд" можна назваць падсумаваннем вышэйзгаданых гутарак-казаняў. Калі ў іх толькі канстатуецца, што "як станем на страшным судзе, нядобра там такім будзе", то ў гэтым творы падрабязна паказана, якім чынам будзе рэалізавана гэта злавеснае абяцанне. Пачнецца ўсё з таго, што "пашлець Бог Міхаіла ў трубу трубіць: / Усіх людзей на суд будзіць. / Трубы страшна заравуць, / Ураз людзей усіх сабяруць" [3, с. 205]. З усёй гэтай масы будуць вылучаны грэшнікі, і кожнай іх катэгорыі будзе прызначана адмысловае пакаранне ў пекле. Фактычна класіфікацыя грахоў і апісанне кары за кожны з іх і складае змест гутаркі "Страшны суд". Такім чынам, перад намі своеасаблівая беларуская "Боская камедыя".

Да тых "гатункаў" грэшнікаў, якія сустракаюцца і ў вышэйзгаданых гутарках-казанях (такіх як непачцівыя дзеці, якія зневажаюць бацькоў, п'яніцы і інш.), у "Страшным судзе" дадаецца мноства іншых. Напрыклад, нечакана шмат увагі аддадзена дзяўчыне, якая старанна мыецца, завівае "грыўку" і румяніць шчокі, "а ў касьцёл, калі як прыдзець, / Дык толькі каб мальцаў відзець" [3, с. 206]. Пакаранне прызначаецца не толькі самой красуні, але і яе маці – за тое, што не лупцавала дачку: "Будзе і матцы пекла, / Чаму малую бізуном ня секла, / Папакутавай за дзяцей, / Што ня секла іх часьцей" [3, с. 206]. Страшны суд настолькі бесстаронні і непрадузяты, што ў пекла трапляюць нават папы і ксяндзы, якія "да сповідзі ня добра прынімалі / І з людзей грошы без міласердзя дралі" [3, с. 203].

Паводле народных уяўленняў, віды катаванняў у пекле цалкам адпавядаюць граху, за які прызначаны, і, як правіла, сімвалічна адлюстроўваюць яго. Напрыклад, п'яніцам гарантуецца, што на тым свеце "будзеш піць смалы каўшочкі, / Аж падпухнуць твае вочкі" [3, с. 206], пляткарак і паклёпнікаў чакае такая кара: "Павешаюць ваш язычок / На распалены driven кручок. / Будзеш хацець адарвацца, / Але ён моцна будзе трымацца" [3, с. 209] і г. д.

Усе творы, пра якія ішла гаворка вышэй, ананімныя – як і вялікае мноства іншых беларускіх гутарак XIX ст. Знаходзіліся, аднак, тыя, каму ўдавалася вынырнуць з бязмежнага мора ананімнасці і вылучыцца сярод масы безыменных гутарнікаў. Сярод такіх, напрыклад, селянін вёскі Лаўрышава Навагрудскага павета Мікола Марозік. Сваю вельмі масавую, пераважна "нізавую", аўдыторыю ён знаходзіў на рэлігійных і іншых народных святах у Мінскай і суседніх губернях, дзе выступаў з уласнымі творамі. Большасць яго гутарак ніколі не друкавалася, а іх рукапісы, датаваныя 1890 г., захоўваюцца ў Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве і ў Бібліятэцы Акадэміі навук Літвы імя Урублеўскіх.

Шмат у чым вершаваныя творы М. Марозіка нагадваюць ананімныя гутаркі-казані. У іх таксама выкрываюцца разнастайныя грахі, вялікія і



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

маленькія чалавечыя слабасці. Асноўны структураўтваральны прыём у сачыненнях М. Марозіка такі самы, як і ў гутарках-казанях, – гэта нагрувашчванне, нанізванне адзін на аднаго прыкладаў амаральных паводзінаў. Праўда, ананімныя гутаркі ўсёабдымныя, яны ахопліваюць усе грахі разам, а М. Марозік звычайна прысвячаў асобны твор адной-дзвюм заганам. Тэмамі для твораў гэтага сялянскага паэта былі п’янства і гультайства, сваркі паміж сваякамі і аднавяскоўцамі і г. д. Нават у гутарцы пад шматабяцальнай назвай “Вясковыя дзяды, або Памінальныя дні” абрад ушанавання памерлых становіцца для аўтара ўсяго толькі нагодай для ганьбавання абжорства. У адной з гутарак М. Марозіка, прысвечанай сямейным і суседскім канфліктам, згадваюцца і забойствы (няверны муж пазбаўляецца ад жонкі, свякроў – ад нявесткі), чаго не сустракаем у іншых разгледжаных тут творах. У сваіх сачыненнях гэты вясковы паэт любіў спасылацца на Біблію і багаслоўскую літаратуру і разважаць з нагоды прыведзеных цытат. Гэта робіць яго гутаркі яшчэ больш падобнымі да пропаведзяў. Таму не дзіва, што этнограф і фальклярыст М. Нікіфароўскі, які ў 1902 г. прысвяціў М. Марозіку захоплены артыкул, характарызаваў яго творчасць і публічныя выступы не столькі як літаратурны феномен, колькі як “народную апостолическую деятельность” [1, с. 480].

## Літаратура

1. Н. Я. Н. [Нікіфароўскі, М.] Глашатаи добрых начал в сельской среде / Н. Я. Н. // Живая старина. – 1902. – Вып. 1–4. – С. 479–488.

2. Пагашчанін [Ластоўскі, В.] Да шуканьня крыніц народнай творчасьці / Пагашчанін // Крывіч. – 1923. – № 3. – С. 44–48.

3. Пацюпа, Ю. Эсхаталагічная паэма “Страшны суд” / Ю. Пацюпа, В. Мартысюк // Беларускі фальклор: Матэрыялы і даследаванні : зб. навук. прац. – Вып. 4. – Мінск : Беларус. навука, 2017. – С. 192–211.

4. Хаўстовіч, М. Даследаванні і матэрыялы: Літаратура Беларусі XVIII–XIX стагоддзяў: Творы невядомых аўтараў / М. Хаўстовіч. – Warszawa : Katedra Białorutenistyki Uniwersytetu Warszawskiego, 2016. – Т. 2. – 300 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова